

ПОШУК СЭНСАЎ ПЕРАД ВЯЛІКАДНЕМ 13

ЗАЦВІЛІ ЯБЛЫНІ — ЧАКАЙ ЗАМАРАЗКАЎ?.. 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

3 МАЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 87 (30221)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Адначасова здраўніцы ФПБ могуць прыняць на аздараўленне больш за 4,5 тысячы чалавек. І апошнім часам мы робім упор на аздараўленне менавіта працоўных. Напрыклад, за мінулы год больш за 50 тысяч членаў прафсаюзаў прайшлі аздараўленне ў нашых санаторыях. Пры гэтым усім членам прафсаюза даецца 25-працэнтная зніжка на аздараўленне. Прафсаюзы праводзяць пастаянную работу, каб зрабіць таннейшым кошт аздараўлення праз калектыўныя дагаворы. Пераконваем наймальнікаў, што гэта важны кірунак, што людзей тут трэба падтрымаць. І на сёння каля 80 % калектыўных дагавораў утрымліваюць нормы, дзякуючы якім людзі могуць атрымаць дапамогу на аздараўленне».*

# У добры шлях!



Май традыцыйна пачынаецца з адкрыцця новага сезона работы Дзіцячай чыгункі ў сталіцы. Нам удалося трапіць на самы першы рэйс у гэтым годзе. Пакуль пасажыры займалі свае месцы ў вагонах, у кабіне да адпраўлення старанна рыхтаваліся машыніст цеплавоза Аліна ЗІМОЎСКАЯ і яе памочнік Вячаслаў СПАСКІ. Дзеці ўжо больш за тры гады навучаюцца ў гуртку «Юны чыгуначнік», дэманструюць свае веды на практыцы і мараць звязаць жыццё з прафесіяй на чыгунцы.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Маладзёжны парламент запусціў інтэлектуальную віктарыну на тэму гісторыі ВАВ.**
- ДАІ праводзіць рэспубліканскую прафілактычную акцыю «Матацыкліст».
- **У ВНУ Беларусі пачынаюць зацвярджаць планы мэтавага прыёму.**
- Мінабароны 9 Мая разгорне ў Мінску 10 тэматычных пляцовак. Любы ахвотны можа паўдзельнічаць у конкурсах і атрымаць брэндаваны сувенір ад Узброеных Сіл.
- **Пытанне рэфармавання прадпрымальніцкай дзейнасці закране каля 40 тысяч ІП.**


ISSN 1990 — 763X




## МЫ ПАМЯТАЕМ!

**Завяршаецца ўручэнне грашовых выплат ад дзяржавы да Дня Перамогі. Адрасаты — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя вязні фашызму, члены сем'яў загінулых у гады вайны ваеннаслужачых. Усяго 8,2 тысячы чалавек, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Апошнія сведкі. Час няўмольны, людзі сыходзяць. 9 Мая заўсёды было святам са слязамі на вачах. Радасць і смутак злучаюцца ў гэтым дні цяпер яшчэ і таму, што ўжо няма ў большасці з нас родных дзядуляў і бабуль, якія тую Перамогу для нас заваявалі. Тым болей хвалюючыя навіны пра тых, хто яшчэ жыве, хто прымае ў гэтыя дні віншаванні асабіста — яны прыклад для нас, узор адносін да жыцця, любові і стойкасці. Нашы карэспандэнты ў рэгіёнах расказалі, як гэта адбываецца.**

СТАР. 3

Працяг тэмы

## «НАША ЗАДАЧА — НАКАРМІЦЬ ДЗЯЦЕЙ ЯК ДОМА»

### Эксперымент у сталічнай гімназіі паказаў, што школьныя абеды могуць быць здаровымі і смачнымі

**У «Звяздзе» ад 20 красавіка было апублікавана інтэрв'ю з намеснікам камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Глебам Лаўрыновічам аб выніках рэалізацыі пілотнага праекта па арганізацыі школьнага харчавання ва ўстановах адукацыі Мінска. Літаральна на другі дзень мы накіраваліся ў сталічную гімназію № 13, якая адной з першых уключылася ў гэты праект. Што нядзіўна: гімназія-наватар імкнецца заставацца на перадавых пазіцыях. Кіраўніцтва і педагагічны калектыў гімназіі — за любую разумную навінку. «Але не за навінку дзеля навінкі, а за тое, што можа палепшыць адукацыйны працэс», — удакладняе дырэктар установы адукацыі сенатар Марына ІЛЬІНА.**

На момант нашага прыезду ў гімназію было ціха — ішлі ўрокі. Да вялікага перапынку, калі дзеці абедаюць, заставалася хвілін пятнаццаць. Мы вырашылі скарыстацца гэтай паўзай і наведаць самае «смачнае» месца — харчаблок, ці, як прывыклі яго называць дзеці, — школьную сталоўку. Суправаджала нас у гэтай экскурсіі **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Анастасія БАРАНАВА**.

У сталовай панавалі звыклыя гукі і пахі. Група вучняў у поўнай «баявой» амуніцыі — шапачках,



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Свежая, духмяная, карысная — такую выпечку гатуюць для дзяцей кожны дзень.**

фартухах і пальчатках — аб чымсьці ціха гутарылі, чакаючы адмашкі накрываць на сталы.

— Гэта дзяжурныя, мае памочнікі, — распавядае Анастасія Яўгенаўна. — Штодня мы адкрываем дзяжурства ў восем раніцы, з лінейкі. Дзяжурныя змяняюцца кожны дзень. За 10—15 хвілін да канца ўрока яны ідуць у сталовую, на свае працоўныя месцы, каб накрыць сталы. І прыбіраюць іх, калі гімназісты ўжо паядуць. Дзяжурства дзецям падабаецца. Я ж з задавальненнем назіраю, як яны працуюць, — сур'ёзна і адказна.

СТАР. 4

Блізкая ўлада

# «Няма пытанняў не нашых»

## Члены Савета Рэспублікі правялі адзіны дзень прыёму на Гомельшчыне

**Правядзенне адзіных дзён прыёму стала ўжо добрай традыцыяй верхняй палаты беларускага парламента. Узяўшы сваім дэвізам выраз: «Няма пытанняў не нашых — усё, што хвалюе людзей, — гэта адказнасць парламентарыяў», сенатары ставяць канкрэтныя задачы па вырашэнні праблем, з якімі да іх звяртаюцца людзі, абмеркаванні самых вострых, самых запатрабаваных у грамадстве тэм, падтрымцы рэгіёна і імкнуцца да таго, каб дзейнасць была максімальна рэзультатыўнай, адкрытай і зразумелай насельніцтву. Асабліва прадукцыйна зарэкамендавалі сябе адзіныя дні асабістых прыёмаў членамі Савета Рэспублікі, калі прыём праводзіцца ва ўсіх адміністрацыйных цэнтрах адной вобласці.**


Фота БелТА.

Прыём на Гомельшчыне быў першым у рабоце новага склікання верхняй палаты парламента.

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей Хаменка працаваў у Светлагорску, Міхаіл Русы — у Жыткавічах, Уладзіслаў Татарыновіч — у Буда-Кашалёве, Ігар Луцкі — у Рагачове, Леанід Заяц — у Рэчыцы. Сяргей Сівец прымаў людзей у Петрыкаве, Аляксандр Багель — у Акцябрскім, Аляксандр Новікаў — у Гомелі. Некаторыя сенатары за дзень прынялі людзей у двух райцэнтрах: Юрый Васільцоў — у Чачэрску і Карме, Кацярына Зенкевіч — у Нароўлі і Хойніках, Андрэй Крываносаў — у Ельску і Лельчыцах, Ксенія Панцюхова — у Калінкавічах і Мазыры, Людміла Сапега — у Добрушы і Ветцы, Ала Смаляк — у Лоеве і Брагіне.

**Асаблівыя спадзяванні ў вырашэнні сваіх пытанняў людзі ўскладаюць на прыёмы, якія праводзіць Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Гэтым разам кіраўнік верхняй палаты парламента працавала ў Жлобіне. На прыём прыехалі грамадзяне нават з іншых абласцей, у прыватнасці з Віцебскай, Брэсцкай і Мінскай. Прыём, як гэта бывае звычайна, доўжыўся практычна цэлы дзень.**

Як заўважыла сама Наталля Качанава, усе пытанні, з якімі прыходзяць людзі, ідуць ад жыцця. У большай ступені іх хвалюе, напрыклад, дарожная тэма, якая датычыцца і гарадоў, і вёсак. «Нездарма Прэзідэнтам пастаўлена задача асаблівую ўвагу ўдзяліць мясцовым дарогам», — акцэнтавала спікер. Гэтую тэму Наталля Качанава вызначыла і на ўзроўні старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко.

«Галоўная задача — каб пытанні людзей былі правамерна вырашаны. Кожнае з іх мы бяром на кантроль і не пакінем без увагі», — падкрэсліла спікер.

Паводле ацэнкі Старшыні Савета Рэспублікі, у мясцовых органаў улады будзе шмат работы ў вырашэнні ўзнятых падчас прыёму пытанняў, аднак ёсць тыя, якія датычацца і нарматыўна-прававой базы. У прыватнасці, размова аб магчымасці рэалізацыі прадукцыі, якую людзі вырошчваюць на сваіх прысядзібных участках. Жыхарка Жлобіна канкрэтызавала хвалюючыя моманты.

«Тут трэба ўважліва паглядзець. Па гэтым пытанні мы разбяромся і абмяркуем яго і з Камітэтам дзяржаўнага кантролю, і з урадам. Падумаем, як спрасціць асобныя моманты, каб людзі маглі спакойна рэалізоўваць такую прадукцыю», — падкрэсліла спікер.

Асобна адзначыла Наталля Качанава прапановы гамяльчан, якія датычацца захавання гістарычнай памяці. «Да нас прыехалі з Гомеля з добрымі прапановамі і ідэямі. Гэта сведчыць аб тым, што нашы людзі памятаюць пра гераічнае мінулае краіны і зацікаўлены, каб гэта гісторыя захоўвалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Асабліва сімвалічна гэта напярэдадні такіх вялікіх свят, як Дзень Перамогі і 80-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, адзначыўшы, што і дзяржава праводзіць маштабную работу ў гэтым плане.

* * *

Як растлумачылі ў Савеце Рэспублікі, акрамя ўрэгулявання праблем грамадзян, пасля кожнага такога прыёму праводзіцца аналіз сітуацыі на месцах. Абмеркаванне гэтых вынікаў будзе вынесена на пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі з удзелам дэпутацкага корпуса, кіраўніцтва рэгіёна. «Шырокамаштабная работа, якая праводзіцца са зваротамі, што паступаюць да нас у Савет Рэспублікі, дае магчымасць дакладна і своечасова вызначыць найбольш актуальныя для рэгіёнаў праблемы, бачыць агульныя тэндэнцыі развіцця і ў выніку выпрацоўваць узважаныя і абгрунтаваныя падыходы, накіраваныя на вырашэнне пытанняў для асобных населеных пунктаў, раёнаў, абласцей і краіны ў цэлым. Пры гэтым многія звароты непасрэдна становяцца прадметам абмеркавання пры падрыхтоўцы праектаў законаў і іншых нарматыўных прававых актаў», — адзначылі ў Савеце Рэспублікі.

***Падрабязна аб тым, з чым прыходзілі людзі на прыём да Наталлі Качанавай, — у найбліжэйшым нумары «Мясцовага самакіравання».***

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Больш чым палова ізраільцян выступаюць за неадкладную адстаўку Нетаньяху



Больш чым палова ізраільцян лічаць, што прэм'ер-міністр іх краіны Біньямін Нетаньяху павінен неадкладна падаць у адстаўку ў кантэксце сітуацыі вакол сектара Газа. Аб гэтым сведчыць апытанне, апублікаванае 12-м каналам ізраільскага тэлебачання. Згодна з вынікамі даследавання, за неадкладную адстаўку кіраўніка ўрада выступае 58 працэнтаў апытаных. Сярод тых, хто на апошніх выбарах 2022 года галасаваў за партыі, якія ўвайшлі ў кіруючую кааліцыю, ідэю адхілення цяперашняга прэм'ера ад пасады падтрымалі 28 працэнтаў рэспандэнтаў. Пры гэтым 54 працэнты апытаных лічаць за неабходнае правядзенне ў краіне датэрміновых выбараў. Акрамя таго, 48 працэнтаў удзельнікаў апытання падтрымалі ідэю неадкладнай адстаўкі міністра абароны Ёава Галанта, 50 працэнтаў рэспандэнтаў выступіла таксама за звальненне начальніка Генштаба ізраільскай арміі Герцы Халеві, 56 працэнтаў апытаных выказалася за адхіленне ад пасады кіраўніка Службы агульнай бяспекі (контрразведкі).

## У выніку абвальвання шашы ў кітайскай правінцыі Гуандун загінулі 48 чалавек

Колькасць загінулых у выніку жудаснага здарэння раніцай у сераду — абвалу на ўчастку хуткаснай аўтамагістралі «Мэйда» (Мэйчжоў—Дабу) у правінцыі Гуандун (Паўднёвы Кітай) — склала 48 чалавек. Аб гэтым паведаміла «Сіньхуа». ДНК яшчэ трох чалавек не ідэнтыфікаваны. 30 чалавек былі шпіталізаваны, іх жыццям нічога не пагражае, паведамілі ўлады горада Мэйчжоў. Паводле іх даных, абвал адбыўся каля 2.10 ночы на адрэзку шашы ў горадзе Мэйчжоў. Даўжыня абваленага ўчастка склала каля 18 метраў, а плошча абвалу — амаль 185 кв. метраў. На аэрафотаздымках відаць, што адзін бок хуткаснай аўтамагістралі абваліўся, у выніку чаго 18 транспартных сродкаў зляцелі з трасы ў вялізную яму. На кадрах, апублікаваных кітайскімі СМІ, бачна, што некаторыя аўтамабілі загарэліся ў выніку падзення. Мясцовыя ўлады заявілі, што прычынай абвальвання шашы маглі стаць магутныя залевы, якія абрынуліся на правінцыю Гуандун на мінулым тыдні.

## У Даніі з-за эканоміі сродкаў адмянілі маштабнае авіяшоу

Больш як 100 тысяч датчан з нецярпеннем чакалі маштабнага Danish Air Show, якое павінна было адбыцца 9 чэрвеня ў аэрапорце Ольбарга. Аднак усяго за пяць тыдняў да пачатку імпрэзу вырашылі адмяніць, паведаміў тэлеканал TV2. «Прычына адначасова простая і парадаксальная: у казне няма грошай на правядзенне авіясалона, хоць палітыкі амаль штодня гавораць аб мільярдных ўліваннях у абарону», — адзначаецца ў матэрыяле. Danish Air Show — найбуйнейшае паветранае мерапрыемства ў Даніі. Яго адмена сёлета з-за недахопу фінансаў адбылася ў той жа час, калі ў парламенце ўхвалена гістарычнае абароннае пагадненне, якое прадугледжвае прадастаўленне мінабароны краіны прыкладна 200 млрд дацкіх крон ($28,8 млрд) на працягу наступных дзесяці гадоў.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор**: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-12, +37529 510-07-63.
**Продавец**: открытое акционерное общество «Витязь», 210605, г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-52-13.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-73441, площадью 5344 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13А/4, наименование – **производственный корпус № 4,** назначение – здание неустановленного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000003000095, площадью 25,6294 га (право долевой аренды), по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13А, целевое назначение – зем. участок для строительства и обслуживания административно-производственных зданий.

**Нач. цена: 1 137 954,11** бел. руб. без учета НДС.

**Задаток: 113 795,41** бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 17.05.2024 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 03.05.2024 с 08.30 по 16.05.2024 до 12.00.

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г.Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.**

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 31.08.2023, 17.11.2023.

**Условия повторного аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи предмета аукциона. **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витязь» от 13.04.2021.**

Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за день до наступления даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: +375 (212) 24-63-12, +37529 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. 8-0212-265383.

## Информация о проведении **07 июня 2024 года в 12.00** аукционных торгов по продаже изолированного помещения, принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 106-23 с инв. номером 500/D-708135681, общей площадью 120,5 кв. м, наименование и назначение – торговое помещение. Ограничения (обременения): аренда по 29.06.2026 | |
| **Начальная цена** – 388 000,00 бел. руб. | **Размер задатка** – 38 800,0 бел. руб. |
| **Продавец имущества** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28-1; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225 22 25, (017) 225 57 89, (017) 225 38 12. **Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. (017) 365 48 36 | |
| **Срок и место приема заявлений: по 05.06.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА») | |

**Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36.

## Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № 2024.Г.002.00050 по продаже государственного имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу https://etpvit.by

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 03 июня 2024 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Продавец:** РУП «Витебское племпредприятие».

**Лот № 1.** Принтер MARKEM-IMAGE 9405, 2017 г. в., серийный номер FR17310177, инв. № 1104, находящийся по адресу: г. Витебск, пер. 1 Шумилинский, 1.

**Нач. цена: 5100,00 бел. руб. без учета НДС.**

Срок внесения задатков и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам: **до 16.00 31.05.2024.** Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу **www.gki.gov.by** в разделе Главная/Бизнесу/ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА/Движимое имущество.

# ПАКАЛЕННЮ ПЕРАМОЖЦАЎ — АД НАШЧАДКАЎ

**Напярэдадні Дня Перамогі на Віцебшчыне пачалі выплачваць матэрыяльную дапамогу ветэранам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны. Марафон падзякі з боку кіраўніцтва раёнаў, устаноў і арганізацый стартаваў 25 красавіка і працягнецца да 4 мая.**



Фота «Витьбичи».

**Віншаванні прымае Міхаіл РАТОМСКІ.**

У паўночным рэгіёне пражываюць каля 140 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і 1766 асоб, якія пацярпелі ад яе наступстваў. Кожнага з іх імкнуцца ахінуць клопатам і ўвагай сацыяльныя службы. Для аказання шэфскай дапамогі за ветэранамі замацаваны ўстановы адукацыі, прадпрыемствы і арганізацыі.

У Лёзненскім раёне ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Надзеі Мікалаеўне Ігнатавай матэрыяльную дапамогу, кветкі і прадуктовыя наборы ўручылі прадстаўнікі кіраўніцтва і арганізацый раёна на чале са старшынёй Савета дэпутатаў Сяргеем Шляднёвым.

Сям'я Надзеі Мікалаеўны была партызанскай, жылі ў Суражскай зоне, там жа канцэнтраваліся партызанскія атрады. «Спачатку мы, падлеткі, проста дапамагалі лясным мсціўцам прадуктамі, здабывалі разведданыя. А потым я разам са старэйшым братам Пятром сышла ў лес. Ён ваяваў, я прала, гатавала ежу, прыглядала за параненымі, хадзіла ў разведку. А мама з сястрой і двума братамі заставаліся ўвесь гэты час у вёсцы. Туды часта прыязджалі карнікі, вяскоўцы былі вымушаныя хавацца ў лясным гушчары. Падчас аднаго з такіх наездаў загінуў мой 8-гадовы брат Валодзя — ён не паспеў уцячы, яго забілі кінжалам», — з болем успаміне ветэран.

Цела брата выносілі пад кулямі ў шынялі, у ім жа малога і пахавалі. Шмат разоў жанчыне было наканавана загінуць, яна нават капала для сябе магілу пад дулам нямецкага аўтамата. Але здарыўся цуд, дапамаглі суседзі, выжыла. Была паранена падчас бамбёжкі, выжывала без вады і ежы ў лесе. Свой уклад Надзея Мікалаеўна ўнесла і ў вызваленне Лёзна — на дзявочых руках выносіла з поля бою параненых.

«Цяпер я з жахам назіраю за падзеямі, якія адбываюцца ва Украіне. На жаль, многія не да канца разумеюць, наколькі важна мірнае неба над галавой, якое маем мы, жыхары Беларусі», — з сумам разважае яна.

У Першамайскім раёне Віцебска віншавалі ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Пятра Раманавіча Масленнікава. Падарункі і належную выплату яму ўручылі намеснік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Таццяна Лазуркіна, начальнік упраўлення сацыяльнай абароны Яўген Артамонаў, намеснік старшыні Першамайскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Алена Мяшкова.

Па пашпарце 15 жніўня ветэрану будзе 96 гадоў, а на самай справе — 98. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Масленнікаў адняў сабе пару гадоў, каб яго не вывезлі ў Германію. Пётр Раманавіч браў удзел у разміраванні тэрыторый і аб'ектаў у 1943—1945 гадах у складзе спецыяльных фарміраванняў. У сакавіку 1944 года ў прымусовым парадку быў вывезены немцамі ў Літву, утрымліваўся ў грамадзянскім лагеры. У ліпені 1944 года, калі палонных вызвалілі чырвонаармейцы, вярнуўся дадому ў Віцебск. Пасля вайны паступіў у музычнае вучылішча, быў кіраўніком мастацкай самадзейнасці на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік», працаваў метадыстам па хоры абласнога Дома народнай творчасці. З 1970 да 1989 года з'яўляўся дырэктарам Міжсаюзнага Дома самадзейнай творчасці абласнога савета прафсаюзаў.

99-гадовага Міхаіла Уладзіміравіча Ратомскага з аграгарадка Копці Віцебскага раёна з надыходзячым Днём Перамогі віншавалі старшыня райсавета дэпутатаў Віктар Дарожкін, дырэктар ТЦСАН Кацярына Лазоўская, прадстаўнікі сацыяльнай службы ў Капцянскай базавай школе. Ветэран, які хутка адзначыць 100-гадовы юбілей, дагэтуль на сваіх нагах і ў ясным розуме. Жахі той далёкай вайны, якую Міхаіл сустрэў 15-гадовым хлопчыкам, за ўсё жыццё так і не сцерліся з памяці.

Пра сябе ён кажа, што нарадзіўся ў кашулі, бо неадначы яго лёс мог абарвацца. У 1943 годзе ён быў у спісе тых, каго немцы чарговай партыяй рыхтаваліся адправіць у Германію, аднак яму і сяброў удалося змяніць у пасведчанні год нараджэння. Пасля падчас аднаго з карных налётаў фашыстаў Міхаіл, брат якога быў партызанам, разам з сямейнай парай апынуўся на расстрэле. Жыццё сыну вымаліла ў немца маці, Ратомскага забралі ў прыфрантавы лагер. Адтуль у красавіку 44-га ён збег разам з сябрам, падаўся ў партызанскі атрад імя Чапаева Сенненскай партызанскай брыгады Лявонава. У жніўні таго ж года юнака і яшчэ з дзясятак былых партызан Сенненскі ваенкамат прызваў на службу ў войска. Ратомскі трапіў у 82-і гвардзейскі стралковы полк, у складзе якога ўдзельнічаў у штурме Кёнігсберга і вызваленні Усходняй Прусіі. Доўгачаканую Перамогу сустрэў там жа, але дадому на Віцебшчыну вярнуўся толькі ў 1949 годзе — праходзіў службу ў Цверы. У ветэрана шмат узнагарод, але самыя дарагія яму — медалі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», ордэн Айчыннай вайны II ступені і нагрудны знак «Партызан Беларусі». Дагэтуль Міхаіл Уладзіміравіч з'яўляецца ў мясцовай школе самым доўгачаканым і пачэсным госцем і не перастае перадаваць маладому пакаленню простую ісціну: пакуль мы помнім, якой цаной заваяваны мір, вайна не паўторыцца.

**ДА ВЕДАМА.** Інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, асобам, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года, а таксама асобам, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у разміраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах, матэрыяльная дапамога будзе аказана ў памеры 4 тысяч рублёў. Асобам, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную вайсковую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на ўзвядзенні абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у тылавых межах дзейных франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог, — у памеры 2 тысяч рублёў. Такую ж суму атрымаюць і асобы, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года да 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаныя медалём «За абарону Ленінграда», а таксама асобы, узнагароджаныя знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда». Былыя вязні фашызму, удовы і дзеці — інваліды з дзяцінства загінулых, зніклых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў атрымаюць дапамогу ў суме адной тысячы рублёў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# «ГАЛОЎНАЕ — ЖЫЦЬ ПАД МІРНЫМ НЕБАМ...»

## Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны — на асаблівым рахунку

**Адзін з адрасоў, па якім завіталі прадстаўнікі Магілёўскага гарвыканкама, Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна абласнога цэнтра, прафсаюза, моладзь, каб уручыць матэрыяльную дапамогу, належыць блакадніцы Лізавеце ХОМЧАНКА.**

Пятага мая Лізавета Пятроўна адзначыць сваё 93-годдзе. Калі пачалася вайна, ёй было 10 гадоў. Разам з бацькамі, дзядулем і трохгадовым братам яна жыла ў камунальцы непадалёк ад Неўскага праспекта горада Ленінграда. Помніць увесь жах ад бамбёжак, паветранай трывогі. З пачаткам вайны бацька працаваў на заводзе суткамі, рэдка прыходзіў дамоў, аднойчы не вярнуўся — загінуў пры бамбёжцы. Хутка не стала і маці, якая выйшла ў горад у пошуках хоць нейкай ежы і таксама загінула. Потым памёр ад недаядання дзед. Клопат пра маленькага брата цалкам лёг на 10-гадовую Лізу. Варыла студзень з клею, елі макуху. Аднойчы іх з братам забралі дарослыя, якія шукалі па кватэрах дзяцей, што засталіся без бацькоў, і вывозілі з блакаднага горада. Лізавета Хомчанка паведаміла, як у дзіцячым доме дзеці чакалі Перамогу і радаваліся, калі яна прыйшла.

— Якое гэта вялікае шчасце — жыць пад мірным небам, — кажа яна. — Гэта самае галоўнае ў жыцці.

**Дырэктар Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна Магілёва Алена АРГУДЗЯЕВА** адзначыла, што ветэраны Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе на асаблівым уліку. За год іх колькасць у раёне паменшылася ўдвая. Служба робіць усё магчымае, каб гэтыя людзі не адчувалі недахоп увагі. Ім аказваецца ўсялякая дапамога па гаспадарцы.

Як паведамілі ў Магілёўскім гарвыканкаме, штогод, у адпаведнасці з рашэннем Прэзідэнта, да Дня Перамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобным катэгорыям грамадзян выплачваецца матэрыяльная дапамога. У перыяд з 25 красавіка і да 4 мая ў Магілёве яе атрымаюць 35 ветэранаў і 380 грамадзян асобных катэгорый. Разам з грашовай дапамогай ветэраны атрымліваюць падарункі ад спонсараў. Віншаванні праходзяць з удзелам навучэнцаў, работнікаў пошты і сацыяльнай службы.



**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

# У памяць аб баях на Проні

**2 мая ў Чавускім раёне адкрыўся маштабны комплекс, прысвечаны вызваліцелям, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Месца сімвалічнае — левы бераг ракі Проні каля вёскі Драгнуха, дзе ў 1943-м на дзевяць месяцаў прыпыніўся фронт і ішлі жорсткія баі за кожны кавалачак зямлі. Ініцыятыва стварэння комплексу належыць ветэранам і жыхарам Чавускага раёна, а таксама Магілёўскаму абласному гісторыка-патрыятычнаму пошукаваму клубу «Віккру», які не першы год праводзіць тут свае вахты памяці і, калі пашчасціць, вяртае з небыцця новыя імёны герояў. У 2022 годзе ініцыятыва была падтрымана Магілёўскім аблвыканкамам і будаўніцтва пачалося.**

Комплекс уражвае маштабамі. Тут пакладзена плітка, высаджаны дрэвы, устаноўлена падсветка. Сюды перанесены помнік байцам і камандзірам пастаяннага і пераменнага саставу штрафных падраздзяленняў Чырвонай Арміі, які быў устаноўлены ў 2017 годзе непадалёк. На ўваходзе на тэрыторыю комплексу стэла ў выглядзе разгорнутай кнігі, на старонках якой схема лініі фронту і апісанні падзей — назвы армій, карпусоў, брыгад, якія былі задзейнічаны ў вызваленні раёна на працягу ўсіх дзевяці месяцаў. Цэнтральнае месца ў мемарыяльнай кампазіцыі займае постаць салдата, які злавіў грудзямі смяротную кулю і падае. Надпіс на пастаменце сведчыць: «Проня 1943—1944. Воінам Чырвонай Арміі. Памяць аб вашым гераізме назаўжды застанецца ў сэрцах удзячных нашчадкаў».

— Пачынаючы з 2 кастрычніка 1943 года да красавіка 1944-га Заходні фронт у Аршанскім, Дубровенскім, Горацкім, Чавускім, Слаўгарадскім раёнах страціў 330 тысяч салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі забітымі, параненымі, прапаўшымі без вестак. Гэта вельмі вялікая лічба нават для фронту, — сведчыць **кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.**

**Старшыня Чавускага райсавета дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН** вельмі трапятліва аднесіцца да тэмы захавання памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны, асабіста займаўся арганізацыяй работ па будаўніцтве і добраўпарадкаванні комплексу. Як ён кажа, гэты комплекс — справа гонару нашчадкаў Пераможцаў, бо чавуская зямля, лічы, — суцэльны мемарыял. На тэрыторыі раёна 99 брацкіх пахаванняў і памятных знакаў. Комплекс стаў сапраўды народнай будоўляй. Для збору ахвяраванняў Чавускі райвыканкам адкрыў дабрачынны рахунак. Работы на мемарыяле выконваліся сіламі чавускіх арганізацый і прадпрыемстваў, у іх прымалі ўдзел мясцовыя жыхары. Падчас нядаўняга суботніка была добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя, і комплекс набыў амаль закончаны выгляд. Але яго развіццё будзе працягвацца.

— Пабудуем яшчэ каплічку, Міністэрства абароны абяцае выдзеліць тэхніку для афармлення комплексу, — удакладняе **старшыня Чавускай раённай ветэранскай арганізацыі Анатоль ВІНКЕВІЧ.** — Мы будавалі мемарыял два гады, збіралі са свету па нітцы. Цэментныя заводы вобласці дапамаглі з цэментам, прадпрыемствы Магілёва наладзілі асвятленне і перадалі будаўнічыя матэрыялы, аблвыканкам выдзеліў 300 тысяч рублёў — кожны рабіў што мог. Бо сродкаў спатрэбілася шмат. У 300 тысяч рублёў нам абышлося толькі стварэнне скульптуры салдата. Яна вельмі добра бачная з трасы Магілёў — Чэрыкаў, бо комплекс знаходзіцца блізка ад яе. Яшчэ калі ішло будаўніцтва, машыны прыпыняліся, людзі падыходзілі, каб пакласці кветкі. Фуры едуць і сігналяць...

У адкрыцці помніка прынялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэлегацыі з аблвыканкама і ўсходніх раёнаў вобласці пачынаючы ад Хоцімска. Жыхары гэтых раёнаў папаўнялі ў 1943-м рады арміі па меры вызвалення рэгіёна ад акупантаў. І шмат хто назаўсёды застаўся на гэтым рубяжы.

Дарэчы, збор сродкаў для поўнай рэалізацыі гэтага праекта працягваецца. Разлікі рахунак размешчаны на сайце Чавускага райвыканкама.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «НАША ЗАДАЧА — НАКАРМІЦЬ ДЗЯЦЕЙ ЯК ДОМА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Марына ІЛЬІНА са сваім намеснікам Анастасіяй БАРАНАВАЙ.

І вось справа зроблена, сталы накрыты. Сёння на абед у гімназіі грэчка, сасіскі, салата са свежых памідораў і кампот з цытрусавых. Празвінеў званок, і сталовая хутка напоўнілася дзецьмі. Мяркуючы па інтэнсіўным бразганні прыбораў аб талеркі, апетыт яны ўжо нагулялі.

— Мы так і разлічылі графік харчавання, каб дзеці да часу прыёму ежы паспелі прагаладацца, з'елі ўсё і з апетытам, — усміхаецца мая суразмоўніца.

— Смачна? — пытаемся ў школьнікаў. У адказ яны дружна ківаюць і паказваюць вялікі палец.

Пакуль гімназісты з задавальненнем паглынаюць абед, мы разважаем аб культуры харчавання.

— Харчовыя звычкі, якія атрымліваюць у дзяцінстве, захоўваюцца да канца жыцця, — кажа Анастасія Яўгенаўна. — Нам важна ў школе стварыць такое асяроддзе, якое б дапамагло прывіць вучням разуменне таго, што ёсць правільнае харчаванне. Харчаблок гімназіі працуе па адзіным двухтыднёвым меню. Падабраныя ў ім стравы, на мой погляд, нават больш карысныя і збалансаваныя, чым хатнія. Калі гаспадыня, імкнучыся надаць ежы лепшы смак і водар, выкарыстоўвае розныя прыправы і спецыі, то ў стравы для школьнікаў мы не дадаём нічога, акрамя солі.



Дзяжурныя за работай.

Я заўважаю, што на сталах няма першага.

— Вельмі вялікі працэнт дзяцей супы не ядуць, — тлумачыць намеснік дырэктара. — Але гэта не значыць, што яго няма ў меню. Мы варым першыя стравы, але пад заказ — на тую колькасць хлопчыкаў і дзяўчат, якія з'ядуць іх гарантавана.

У пацвярджэнне гэтых слоў да раздатачнай падыходзіць юнак і просіць наліць яму малочны суп, які сёння ў меню.

— Нарэшце мы адаптавалі пералік страў да смакавых прыхільнасцяў дзяцей, — працягвае Анастасія Яўгенаўна. — Ажыццявіць гэта нам дапамагло новае кухоннае абсталяванне. Дзякуючы параканвектаматам ежа набывае зусім іншую якасць. Мы перасталі пячы — кухары гатуюць на пары, вараць, тушаць, запякаюць. І ўсё гэта атрымліваецца не толькі карысным, але і надзвычай смачным. У нас нават не вельмі ўпадабаная дзецьмі паравая гародніна расхопліваецца як гарачыя піражкі.

Дарэчы, аб піражках. Каля буфета сабралася невялікая чарга.

— Няўжо не наеліся? — здзіўляюся я.

— Сёння аўторак, а гэта значыць, кухары прыгатавалі найсмачнейшую піцу. Ёсць і разнастайная салодкая выпечка, але яна прадаецца кожны дзень. Піцу пякуць раз на тыдзень. І яна настолькі прыйшлася дзецям даспадобы, што яны аўторкі чакаюць з нецярпеннем.

Уся выпечка тут гатуецца таксама ў параканвектаматах. Так што можна не турбавацца аб здароўі дзяцей.

Сталовая паступова пусцее, і дзяжурныя прымаюцца за прыборку. Адходаў практычна няма, а гэта значыць, што кухары спрацавалі на «дзясятку». Чарговы раз.

— У гімназіі навучаецца 1200 чалавек, — падводзіць вынік намеснік дырэктара. — Ахоп дзяцей гарачым харчаваннем — стапрацэнтны. Якасцю і падборам страў задаволены дзеці і іх бацькі. Гэта той вынік, якога мы дабіваліся.

Звініць званок на чарговы ўрок, і ў школе на 45 хвілін зноў усталёўваецца цішыня. Прыдатны час, каб даведацца пра ацэнку пілотнага праекта з прыватнасці і рацыёну школьнікаў у цэлым у кіраўніка ўстановы адукацыі.

— Сёння для мяне як для дырэктара гімназіі пытанне харчавання дзяцей адно з прыярытэтных. Бо гаворка ідзе аб падрастаючым пакаленні. Таму, калі эксперымент па школьным харчаванні толькі пачалі запускаць і ў нас спыталі, ці не зможам у ім паўдзельнічаць, мы адказалі, што не проста зможам, а вельмі жадаем. Наша імкненне віталі і Міністэрства адукацыі, і Мінгарвыканкам — там добра ведаюць гімназію і тое, што наша ацэнка будзе максімальна сумленнай і справядлівай, — расказала Марына Ільіна.

Пераацаніць значнасць праекта, на думку кіраўніка ўстановы, цяжка. Бо харчаванне дзяцей — гэта сацыяльна значны кірунак. І іх здароўе шмат у чым вызначае правільны, збалансаваны набор прадуктаў у меню, а таксама тое, як гэтыя прадукты прыгатаваны. Калі дзіця сытае і здаровае — лепш успрымае не толькі школьную праграму, але і з задавальненнем удзельнічае ў іншых мерапрыемствах.

— Нагрузка на вучняў гімназіі каласальная, — працягнула дырэктар. — І гэта не таму, што мы іх так нагружаем. Яны самі працуюць на вынік: апроч асноўных заняткаў нашы навучэнцы наведваюць факультатывы, аб'яднанні па інтарэсах. Актыўна займаюцца спортам, удзельнічаюць у алімпіядах рознага ўзроўню і перамагаюць. Таму здаровае і паўнавартаснае харчаванне — не даніна модзе, а жыццёвая неабходнасць.

У рэалізацыі праекта па арганізацыі школьнага харчавання ўдзельнічалі некалькі ведамстваў краіны: Міністэрства адукацыі, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Міністэрства аховы здароўя. Было ўцягнута шмат спецыялістаў, на набыццё сучаснага абсталявання затрачаны немалыя бюджэтныя сродкі. «Мы таксама не засталіся ўбаку — супрацоўнічалі з работнікамі камбіната школьнага харчавання. Уносілі свае прапановы і ацэньвалі меню. Вялікую тлумачальную работу праводзілі з дзецьмі. Расказвалі ім аб здаровай ежы, аб тым, што яна можа быць не толькі карыснай, але і смачнай, а стравы з яе — прывабнымі», — дадала Марына Ільіна. — Гэта таксама вельмі важна. Мы падымалі гэту тэму на класных гадзінах, уроках здароўя, наладжвалі выставы і кірмашы карысных страў. Усё гэта спрацавала на вынік, лічу, максімальна добры. Эксперымент паказаў, што школьнікаў можна карміць якасна, здарова і смачнай ежай. І, што немалаважна, пры гэтым улічваць іх перавагі. Наша задача — накарміць дзяцей як дома. І з гэтым выдатна спраўляюцца кухары харчаблока».

З асаблівай цеплынёй Марына Аляксандраўна адгукаецца аб загадчыцы вытворчасці Святлане Мацкевіч:

— Мама траіх дзяцей пра тое, як і што яны павінны есці, ведае не па чутках. Святлана Васільеўна сама падабрала кухараў і стварыла такія ўмовы, што яны не адзін год працуюць зладжанай і гарманічнай камандай. Гатуюць ад душы. І дзеці гэта цэняць. А яшчэ — утульную, амаль хатнюю атмасферу школьнай сталовай, дзе іх сустракаюць усмешкай, добрым словам і смачнай ежай. Таму працаўнікі харчаблока для іх — не безаблічныя кухары і буфетчыцы, а цёця Света, цёця Іра...

— Фактычна яны — работнікі камбіната школьнага харчавання, — кажа Марына Аляксандраўна. — Але для мяне яны і нашы работнікі таксама. Мае функцыі як кіраўніка, вядома, назіраць. Але чалавечыя ўзаемаадносіны не менш важныя. Яны для калектыву гімназіі не чужыя, таму абавязкова віншуем працаўнікоў харчаблока з асабістымі святамі. А напярэдадні 8 Сакавіка з самай раніцы я на кухні з букетамі кветак і абавязкова цёплымі, шчырымі словамі падзякі і віншаванняў. Калі ў іх узнікаюць пытанні ці здараюцца праблемы, дапамагаю іх вырашаць. Як любому члену нашага калектыву.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ПАЎНАВАРТАСНЫ АБЕД НА ПЕРАПЫНКУ

## Путрышская школа завяршае вучэбны год, на працягу якога харчаванне вучняў было арганізавана па-новаму

**Згодна з рэкамендацыямі, прыём ежы адбываецца праз 2,5 гадзіны пасля пачатку заняткаў. Галоўны акцэнт зроблены на рацыёне. З'явіліся новыя стравы, якія прайшлі апрабацыю ў ходзе рэспубліканскага пілотнага праекта і ўключаны ў тэхналагічныя зборнікі.**

Сярэдняя школа ў аграгарадку Путрышкі прасторная і сучасная, хоць і пабудавана амаль паўстагоддзя таму. Такі праект у Гродзенскім раёне не тыпавы — падобных усяго некалькі. Штогод вядзецца рамонт. Летась, напачатку новага навучальнага года, асаблівая ўвага надавалася абсталяванню харчавога блока і сталовай.

У школе займаюцца 217 вучняў, і ўсе ахоплены харчаваннем. Абеды бясплатныя, але гэта не адзіны фактар наведваць школьную сталоўку. Па словах **Зінаіды МЕЛЬНІЧАК**, якая **адказвае за школьнае харчаванне**, дзецям падабаецца новы рацыён з незвычайнымі назвамі. Напрыклад, марскія нагетсы, мітболы з сырам (з курынага філе), тварожныя шарыкі, запяканка «дзень-ноч». Нечаканым вынікам эксперымента стала ўвядзенне ў рацыён супоў.

— Да верасня мінулага года ў нас не варылі супы. Але практыка паказала, што дзеці не адмаўляюцца ад іх. Вядома, ёсць выпадкі, калі той ці іншы вучань не хоча есці, напрыклад, гарохавы суп, хоць іншыя ядуць з задавальненнем. Між тым заўсёды ёсць магчымасць перагледзець меню. Калі мы бачым, што тая ці іншая страва не вельмі падабаецца і большасць ідзе ў адходы, звяртаемся да тэхнолагаў і кажам, што такая ежа не ў прыярытэце. Тады страва замяняецца, — расказала Зінаіда Мельнічак.



Ежа гатуецца згодна з тэхналагічнымі картамі, якія складае спецыяльная група, яна працуе пры аддзеле адукацыі райвыканкама. Тут распрацоўваюцца прыкладныя рацыёны на два тыдні для ўсіх школ раёна. Меню складаецца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі рэспубліканскага зборніка, які выпушчаны па выніках пілотнага праекта. Разам з тым, школам даецца свабода ў выбары найбольш аптымальных графікаў арганізацыі харчавання.

На думку Зінаіды Мельнічак, патрабаванні да школьных абедаў узраслі. Дадзенае пытанне праходзіць пастаянны маніторынг у КДК. Неаднаразова праблема разглядалася і на ўзроўні ўрада. Гэта апраўдана, бо правільны прыём ежы з'яўляецца важным складнікам здароўя дзяцей.

— Сутнасць эксперымента яшчэ і ў тым, што школьнікам 5—11 класаў прапануецца паўнавартасны абед. У яго ўваходзіць салата, суп, гарнір з рыбнай альбо мясной стравай, напой. Гэта вельмі якасная трапеза, — лічыць суразмоўца.

Некалькі гадоў таму школа набыла параканвектамат, які дазваляе гатаваць ежу з захаваннем карысных рэчываў. Дарэчы, усе школы Гродзенскага раёна сёлета будуць забяспечаны параканвектаматамі.

А вось пельмені з кетчупам і хот-догі ў Путрышскай школе не прапануюць. Лічаць, што школьнікаў трэба прывучаць да здаровага харчавання на пастаяннай аснове. Гэту пазіцыю падтрымліваюць і бацькі вучняў. Значную работу праводзіць школьны савет па харчаванні, які прымае меры па фарміраванні культуры харчавання, праводзіць анкетаванне дзяцей і бацькоў. Як правіла, істотных заўваг няма, абсалютная большасць задаволена станам, які склаўся ў выніку эксперымента.

**17.30, 18.25, 19.20, 20.10, 21.10, 22.05, 23.00** «Ліквідацыя» (16+).
**23.55** «Злодзей» (16+).
**1.35** «Край» (16+).
**3.35** «Першы Оскар» (12+).

## ЯСНАе

**4.55** Серыял «Бандыцкі Пецярбург: Барон» (16+).
**6.45** Серыял «Загадана знішчыць. Аперацыя «Кітайская шкатулка» (12+).
**8.20** «Ясна аб мініфутболе».
**8.50** Серыял «Люты» (16+).
**10.30** Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).



**12.05** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (16+).
**13.45** Маст. фільм «07-ы мяняе курс» (12+).
**15.20** Серыял «Горы, якія страляюць» (16+).
**17.00** Футбол. «Маладзечна» — «Орша».
**19.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Віцебск» — «Смаргонь».
**21.00** «Час высокіх тэхналогій».
**21.25** Серыял «Мянтоўскія войны-4» (12+).
**23.00** Маст. фільм «Непаслушнік» (16+).
**0.55** Маст. фільм «Алігарх» (18+).
**3.00** Маст. фільм «Механік» (16+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 19.55** «Праверана на сабе. Жаночы погляд» (12+).
**7.35, 18.45, 22.25** «Віцебшчына. Партызанскі край».
**8.00, 14.50** «Чырвоны колер папарацi». Маст. фільм (12+).
**9.10** «У бой ідуць адны «старыя». Маст. фільм (12+).
**10.40** «Дзяржаўная граніца. «Чырвоны пясок». Маст. фільм (12+).
**13.05, 13.55** «Наркамаўскі абоз» (16+).
**16.00, 16.45** «Чырвоная капэла» (12+).
**17.30, 0.45** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**18.00** «Вораг ля варот. Масква 41-га. Рубеж абароны — Пушкінскі пляц». Дак. фільм (12+).
**19.20** «Полацкі ўмацаваны раён».
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50** «Жывая памяць».
**20.10** «Дзяржаўная граніца. «Год сорак першы». Маст. фільм (12+).
**23.20** «Фаня Алер. Вайна без антракту». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Заложнік «Сатурна». Без права быць сабой». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Ілжэпартызаны. Па легендзе Абвера». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Доктар Слон. Стаўка на чырвонае». Дак. фільм (12+).
**2.15** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**2.45** «Трасцянец. Алея смерці». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**3.45** «Брэсцкая крэпасць. Невядомая абарона». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** Зона Х (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.00, 11.45, 12.15, 13.05 Меладрама «Лішні» (12+).**
**10.50, 0.30** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 23.10 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**18.45, 19.20 Меладрама «Каця-Каця» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**0.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05 Драма «Ляцяць жураўлі» (12+).**
**11.40 Драма «Вяртанне з фронту» (12+).**
**13.05** «100 месцаў, дзе паесці» (16+).
**14.00** «Новы дзень» (12+).
**14.35** «Дарагая, я забіў» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** Гэта мая сям'я (12+).
**17.55** «Стаць шэфам» (16+).
**19.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**21.10** Спартлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Драма «Падольскія курсанты» (12+).**
**23.30 Дэтэктыў «Залатая кроў. Чорны Арлоў» (12+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.00, 12.50, 20.30** «Навіны культуры».
**8.10 «Гарачы снег». Маст. фільм (12+).**
**9.55 «Дзяўчынка шукае бацьку». Маст. фільм (6+).**
**11.25** «Люблю і памятаю».
**12.10** «Архітэктура Беларусі».
**13.00, 18.10** «Вялікая вайна». Дак. драма. (12+).
**13.50, 19.00 «Дарога на Берлін». Маст. фільм (12+).**
**15.15** «Сіла веры».
**15.45** Рэспубліканскі фестываль «Беларусь — мая песня».
**17.20** «Кадры жыцця».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Батальёны просяць агню». Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**6.55** Хакей. Міжнародны турнір. Расія 25 — Беларусь.
**8.55** Фактар сілы.
**9.25, 23.25** Самба.
**10.40** На Спорце.
**11.00** Сучаснае пяцібор'е. Кубак свету.
**12.30** Танцавальны спорт.
**14.00** Дзюдо.
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Крылы Саветаў» (Самара) — «Ахмат» (Грозны). У перапынку — Спорт-цэнтр.
**17.55** Пляжны футбол. Суперкубак Беларусі-2024. ЦАР-Магілёў — «Брэст-Волга».
**18.55** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Шахцёр» (Салігорск) — «Энергія» (Гомель).
**20.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Днепр» (Магілёў) — ФК «Мінск». У перапынку — Спорт-цэнтр.
**22.55** Авертайм.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00, 11.15** «Нябесны ціхаход» (6+).
**12.00, 13.15** «Давайте понимать друг друга с полуслова...» (12+)
**14.10** «Зоркі кіно. Яны змагаліся за Радзіму» (12+).
**15.15, 16.20 Фільм «Аніматар» (16+).**
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (16+).
**19.00** «Поле цудаў». (16+).
**21.20** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.30 Фільм «Дарога дадому» (12+).**
**0.55** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. «Школьны свет» (12+).
**10.40** Дак. праект. «Таямніцы космасу» (12+).
**14.00, 0.50 «Непадсудныя». Серыял (16+).**
**16.50** «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
**17.20** Дак. праект «Закрыты архіў» (16+).
**18.45** «У пошуках ісціны. Эфект плацэба».
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** «Крокі Незалежнасці».
**20.55 «Шэф. Новае жыццё». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00 Тэлесерыял «Начныя ластаўкі» (16+).**
**9.00, 10.10, 16.15, 18.45 Тэлесерыял «Разведчыцы» (16+).**
**10.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**22.55 Тэлесерыял «Загадана знішчыць. Аперацыя «Кітайская шкатулка» (16+).**
**2.20** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**3.35** Мультфільмы (6+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05** «Імператар без імперыі. Трон на штыках» (16+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Кропкі над і» (16+).
**12.40, 14.40 Фільм «А досвіткі тут ціхія...» (12+)**
**16.45** «Ствараем разам».
**17.40** «Песні Перамогі».
**19.10** «Данбас. 10 гадоў» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Пазыўны «Пасажыр» (12+).**
**23.45 Фільм «Балканскі рубеж» (16+).**

## НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**8.45, 10.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.00, 22.30, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**13.05** Спецпраект АТН (12+).
**14.15** «Чакай мяне» (12+).
**15.15, 16.30 Серыял «Пёс» (16+).**
**16.20, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**19.30, 20.15, 21.10, 22.35, 23.45 Фільм «Загавораны» (16+).**
**20.40** «НЗ.by: час вынікаў».

## 8 канал

**7.00, 21.05** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**10.00 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).**
**11.15** «Любімае кіно».
**12.00** «Рэтра ТБ».
**14.15 Серыял «Дальнабой» (16+).**
**15.50 Драма «Апошняе слова» (16+).**
**17.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.25 Драма «Лекі ад смерці» (16+).**
**18.55** «Надвор'е» + «Эрана».
**19.00** «Апошні артыкул» (16+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.15 Драма «Бедныя-няшчасныя» (18+).**
**23.35** «Начны серыял».



## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.00** «Біблейскі сюжэт».
**7.30, 2.10** «Верую. Вяртанне да сябе». Дак. фільм.
**8.15** «Тэатральны летапіс».
**8.45** «Актрыса». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 0.45** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** XX стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Вайна Інакенція Смактуноўскага».
**13.20, 22.40** «Вызваленне». Маст. фільм.
**14.50** Больш, чым каханне.
**15.30** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**16.00** «Белая студыя».
**16.45** «Вайна Юрыя Нікуліна».
**17.15** Дзмітрый Шастаковіч. Сімфонія 7 «Ленінградская».
**18.45** «Сустрэча на Курскай дузе». Дак. фільм.
**19.45** «Дарога на Ялту».

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**7.00, 8.35, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 20.40, 21.40, 23.35, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Давайце зробім гэта легальна» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**12.55** Маст. фільм «Мулен Руж» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**18.55** Маст. фільм «Ніначка» (16+).
**0.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**0.45** «Рок-н-рол ТБ» (16+).
**1.25** Маст. фільм «Яго дзяўчына Пятніца» (16+).

## EuroSport 1

**3.15, 6.30** Скалалажанне. Мужчыны SPEED.
**4.00, 8.00, 12.00, 13.00, 23.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
**6.00, 20.00, 20.30** Алімпійскія гульні (6+).
**7.15** Скалалажанне. Жанчыны SPEED.
**9.30** Конны спорт (6+).
**10.30** Скалалажанне. Мужчыны BOULDER.
**11.45** Кузаўныя аўтагонкі (6+).
**18.45, 22.00** Снукер (6+).
**21.00** Веласпорт. «Тур Венгрыі». Мужчыны (16+).
**1.00** Веласпорт. Tro Bro Leon. Мужчыны (16+).
**2.00** Скалалажанне. Жанчыны BOULDER.

## Кінакамедыя

**0.50** «Родныя» (18+).
**3.25** «Шэф Адам Джонс» (18+).
**5.15** «Былая з таго свету» (16+).
**7.05** «Асілак Санта-Клаус» (12+).
**8.55** «Пра што гавораць мужчыны. Працяг» (18+).
**10.45** «Маё злачынства» (18+).
**12.40** «Мая жудасная сястра-2».
**14.15** «Зваротная сувязь» (16+).
**16.05** «Нумар 1» (12+).
**17.55** «Старыя шышкі» (18+).
**19.30** «Вальда» (16+).
**21.35** «Небяспечны бізнес» (18+).
**23.30** «Пра што гавораць мужчыны» (18+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.25** «Містычныя гісторыі» (16+).
**10.20, 16.10** «Чытальнік» (16+).
**11.15, 4.10** «Глядзі сам» (16+).
**11.35, 17.10** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.20, 18.55** «Сляпая» (16+).
**14.40, 20.20** «Варажбітка» (16+).
**21.50** «Пакапайцеся ў маёй памяці» (16+).
**23.30** «Сакалова падазрае ўсіх» (16+).
**1.10** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**2.05** «Чалавек у жалезнай масцы» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.30** Адаптацыя (16+).
**7.20** Словы (12+).
**9.15** Вялікія вочы (16+).
**11.15, 1.10** Кальцо дракона (12+).
**13.05, 2.40** Эспен у каралеўстве троляў (6+).
**15.10, 4.20** Эспен у пошуках Залатога замка (6+).
**17.10** Тры арэшкі для Папялушкі (6+).
**19.00** Прыгажуня і пачвара (12+).
**21.10** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**23.15** Тайна Мунакра (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Пін-код» (6+).
**6.10** «Тры каты» (6+).
**6.40** «Смяшарыкі» (6+).
**7.05** «Горка!» (16+)
**9.05** «Горка!-2» (16+).
**10.55** «Рашн Поўдзень» (16+).
**13.20** «Аднакласнікі.ru: наCLICKай поспех» (12+).
**15.20** «Поўнае ператварэнне» (16+).
**17.05** «Адзін удых» (12+).
**19.00** «Чэмпіён свету» (6+).
**21.45** «Адзінаццаць маўклівых мужчын» (12+).
**0.10** «Містар Накаўт» (16+).
**2.10** «Бітва за Севастопаль» (16+).
**4.05** «Нязломны» (16+).

## ЯСНАе

**4.40** Серыял «Бандыцкі Пецярбург: Барон» (16+).
**6.30** Серыял «Загадана знішчыць. Аперацыя «Кітайская шкатулка» (12+).
**8.05** «Раніца ЯСНАЯ».
**9.10** Серыял «Люты» (16+).
**11.00** Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
**12.35** Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (16+).
**14.20** Маст. фільм «Я — лялька» (16+).
**16.05** Серыял «Горы, якія страляюць» (16+).
**17.45** Серыял «Гарачая кропка-2» (16+).
**19.25** Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
**21.10** Серыял «Мянтоўскія войны-4» (12+).
**22.45** Маст. фільм «Лёс дыверсанта» (12+).
**0.45** Маст. фільм «Ідзі і глядзі» (16+).
**3.05** Маст. фільм «Перад світаннем» (16+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Брэсцкая крэпасць. Невядомая абарона». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 17.10, 22.35** «Віцебшчына. Партызанскі край».
**7.50, 23.20** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**8.50, 13.55** «Чырвоны колер папарацi». Маст. фільм (12+).



**9.55** «Дзяржаўная граніца. «Мірнае лета 21-га года». Маст. фільм (12+).
**12.10, 13.00** «Паршывыя авечкі» (16+).
**15.00, 15.45** «Чырвоная капэла» (12+).
**16.30** «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі». Дак. фільм (12+).
**17.35, 18.25** «Наркамаўскі абоз» (16+).
**19.20** «Полацкі ўмацаваны раён».
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50** «Жывая памяць».
**19.55** «Дзяржаўная граніца. «Усходняя граніца». Маст. фільм (12+).
**22.25** «Паміж мірам і вайной. Спецзаданне». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Шпіён з-пад Вілейкі». Дак. фільм (12+).
**0.45** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**2.45** «Вайна разведак. Курсанты асаблівага прызначэння». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Контрразведка. Рассакрэчаны фронт». Дак. фільм (12+).
**3.45** «Па плане «Д». Як пачыналася сакрэтная вайна». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслiруецца са скрытымі субцітрамі.*

### Беларусь 1

**6.15, 9.30, 12.30, 15.30, 23.00 Драма «Маладая гвардыя» (16+).**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.30, 19.30, 21.00** «За паству і Айчыну». Тэлефільм АТН (12+).
**19.00** Цырымонія ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!»
**20.00** Панарама.
**21.30** Гала-канцэрт «У дзевяць гадзін вечара пасля вайны».
**23.55 Драма «Тры дні да вясны» (12+).**

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 15.35** Тэлебарометр.
**10.05** «Сям'я. Перазагрузка». Дак. драма (16+).
**10.35 Трагікамедыя «Жэня, Жэнечка і «кацюша» (12+).**
**11.55, 21.15 Кінараман «Яны змагаліся за радзіму» (12+).**
**14.35** «ПІН_КОД» (12+).
**15.40 Драма «Падольскія курсанты» (12+).**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.00 Драма «Ляцяць жураўлі» (12+).**
**19.30** Як дома (16+).
**19.55 Драма «Вяртанне з фронту» (12+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.

### Беларусь 3

**7.30** «Новыя людзі».
**8.00 «Батальёны просяць агню». Маст. фільм (12+).**
**12.20, 16.10** «Памяць зямлі маёй».
**12.35** Гала-канцэрт XXVII тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда».
**14.35 «Лёс чалавека». Маст. фільм (12+).**
**16.30** «Апошні сведка. Імгненні жыцця». Дак. фільм (12+).
**17.05, 18.05 «Баявая адзінка». Маст. фільм (16+).**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Гарачы снег». Маст. фільм (12+).**
**22.40** «Героям пераможнага мая!»

### Беларусь 5

**6.55** Футбол. Кубак Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Дынама-Мінск».
**8.55** Між іншым.
**9.15** Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны.
**11.00** Слэм-данк.
**11.30** Футбол. Кубак Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Іслач» (Мінскі р-н).
**13.25** Танцавальны спорт.
**16.25** Фіз-ра.
**16.55** Фактар сілы.
**17.25** Хакей. Міжнародны турнір. Расія 25 — Беларусь. У перапынках — Спорт-цэнтр.
**19.50** Самба.
**21.25** Спорт-цэнтр.
**21.35** Гульні «на вырост».
**22.05** Дзюдо.
**0.10** Вялікі спорт.

### АНТ

**7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 9.10** «Наша раніца».
**10.00, 11.15, 13.15 Фільм «Яны змагаліся за Радзіму» (16+).**
**13.30, 16.20 «Дыверсант. Крым» (16+). Фільм.**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.20, 19.30** Дзень Перамогі. Святочны вечар (12+).
**19.00** Цырымонія ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!»
**21.20 Фільм «Белы тыгр» (12+).**
**23.25 Фільм «У бой ідуць адны старыя» (12+).**

### СТБ

**5.55** «Рэспубліка з зорачкай: час перамагаць». Дак.фільм.
**6.50 Маст. фільм «Лёс чалавека» (12+).**
**8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 11.00, 14.05 «Батальёны просяць агню». Серыял (12+).**
**14.45 Маст. фільм «Беларускі вакзал» (12+).**
**17.15** «Гаворыць нямая памяць». Дак.фільм.
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.00, 20.35 Маст. фільм «Праведнік» (12+).**
**19.00** Цырымонія ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!»
**23.15 «Лёс дыверсанта». Серыял (12+).**

### МІР

**5.00** «Усё для фронту» (16+).
**7.20** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**7.45 Маст. фільм «Цягнік ідзе на ўсход» (16+).**
**9.15, 11.30, 16.15 Тэлесерыял «Бомба» (16+).**
**9.55, 16.00, 19.00** Навіны.
**10.00** «Памяць сэрца».
**17.10 Маст. фільм «Гарачы снег» (16+).**
**18.56** Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму. Хвіліна маўчання.
**19.15, 22.10 Тэлесерыял «Чорныя ваўкі» (16+).**
**22.00** Святочны салют у гонар 79-й гадавіны Перамогі.
**2.00 Тэлесерыял «Начныя ластаўкі» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.05, 9.05** «Новая раніца».
**9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**10.00** Масква. Красная плошча. Парад, прысвечаны Дню Перамогі.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** Вялікі святочны канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі.
**14.40** «Тайны Беларусі».
**16.00** «Мікалай Кісялёў. Шлях праведніка».
**17.40, 18.00, 19.30** «Песні ад усёй душы» ў Дзень Перамогі (16+).
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**19.00** Цырымонія ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!»
**21.30, 23.15 Фільм «Т-34» (16+).**

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 8.20** Сёння. Галоўнае.
**6.20, 8.35, 11.20 Фільм «Мамі-на зорачка» (16+).**
**8.00, 9.45, 10.45, 16.00** Сёння.
**10.00** Масква. Красная плошча. Парад, прысвечаны Дню Перамогі.
**12.15 Фільм «Тапор» (16+).**
**14.00 Фільм «Тапор. 1943» (16+).**
**16.20, 18.00 Фільм «Тапор. 1944» (16+).**
**17.55** Хвіліна маўчання. Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму.
**18.05, 19.35 Фільм «Тапор 1945. Кёнігсберг» (16+).**
**19.00** Цырымонія ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!».
**20.35 Фільм «Пазыўны «Жураўлі» (16+).**

### 8 канал

**7.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.25** «Афіцэры» (12+).
**10.00 Серыял «Лейтэнант Каломба» (16+).**
**11.35 Драма «У бой ідуць адны старыя» (12+).**
**13.05 Баявік «У жніўні 44-га» (16+).**
**14.50 Серыял «Дальнабой» (16+).**
**16.35 Драма «Смута» (16+).**
**17.20, 18.55** «Надвор'е» + «Эра-на».
**17.25 Драма «Лекі ад смерці» (16+).**
**19.00** «Апошні артыкул» (16+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.15** «Надвор'е».
**21.20 Драма «Забытае» (18+).**
**0.25** «Начны серыял».





### Культура

**6.30** Любімыя песні.
**6.50** «Ноч кароткая...» Дак. фільм.
**7.45** «Смелыя людзі». Маст. фільм.
**9.15** «Сведкі часу». Дак. серыял.
**9.55** «Малахаў курган». Маст. фільм.
**11.15** «Чыстая перамога. Бітва за Севастопаль». Аўтарскі фільм.
**12.00, 0.15** «Дом, у якім я жыву». Маст. фільм.
**13.35** «Вялікія фатографы вялікай краіны. Яўген Халдзей». Дак. фільм.
**14.15, 16.20, 17.40** «Вызваленне». Маст. фільм.
**18.55** Светлай памяці загінулых у барацьбе супраць фашызму. Хвіліна маўчання.
**19.00** Астравы.
**19.40** Перадзелкіна.
**21.05** «Розныя лёсы». Маст. фільм.
**22.50** Клаўдзія Шульжэнка.
**23.30** «Колер жыцця. Пачатак». Дак. фільм.
**1.50** Краіна птушак. «Лета з кругіцалоўкай». Дак. фільм.
**2.30** «І ўсё ж мы перамаглі!»

### Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.55** Маст. фільм «Мулен Руж» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.30, 14.40, 15.40, 17.35, 18.35, 20.20, 21.40, 23.30, 1.00, 2.35, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**12.55** Маст. фільм «Нінаечка» (16+).
**18.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**18.50** Дак. фільм «Хвіліна маўчання» (12+).
**19.15** Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка» (16+).
**0.00** «СеваАлогія» (18+).
**1.20** Маст. фільм «Давайце зробім гэта легальна» (16+).

### EuroSport 1

**3.15, 19.30** Скалалажанне. Жанчыны SPEED.
**4.00, 8.00, 12.00, 13.30, 23.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія». Мужчыны (16+).
**6.00, 9.30, 20.15, 2.00** Снукер (6+).
**18.45** Скалалажанне. Мужчыны SPEED.
**21.00** Веласпорт. «Тур Венгрыі». Мужчыны (16+).
**22.00** Парусны спорт (6+).
**1.00** Скалалажанне. Мужчыны BOULDER.

### Кінакамедыя

**1.20** «Дамашняе відэа» (18+).
**3.55** «Настаўнік года» (16+).
**6.00** «Мільярд» (12+).
**7.55** «Больш, чым сябар» (16+).
**9.45** «Родныя» (18+).
**11.35** «Ліберэя: паляўнічыя за скарбамі» (12+).



**13.35** «Вальда» (16+).
**15.40** «Сардэчна запрашаем у сям'ю» (16+).
**17.55** «Шэф пад прыкрыццём» (18+).
**19.30** «Утаймаванне свавольнага» (16+).
**21.25** «Без тармазоў» (16+).
**23.10** «Пра што яшчэ гавораць мужчыны» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.15** «Знак бяды» (16+).
**10.50, 0.20** «Снайпер. Зброя адплаты» (16+).
**14.00, 3.15** «Снайпер-2: Тунгус» (16+).
**17.00** «Сляды апостолаў» (16+).
**21.00** «Пёрл-Харбар» (16+).
**0.00** «Глядзі сам» (16+).

### ТБ1000

**6.00** Тры арэшкі для Папялушкі (6+).
**7.30** Я змагаюся з воламі (12+).
**9.30, 11.20, 13.05** Зачараванае каралеўства (16+).
**15.00** Вялікія вочы (16+).
**17.00** Словы (12+).
**19.00** Піяніст (16+).
**22.00** Жонка наглядчыка заапарка (16+).
**0.30** Выбар капітана Карэлі (16+).
**2.35** Прыгоды Падынгтана (16+).
**3.55** Прыгоды Падынгтана-2 (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Пін-код» (6+).
**5.55** «Тры каты» (6+).
**6.20** «Смяшарыкі» (6+).
**6.40** «Вырататаваць Ленінград» (12+).
**8.25** «Развітвацца не будзем» (16+).
**10.40** «Першы Оскар» (12+).
**12.55** «Радавы Чээрын» (12+).
**14.45** «Лётчык» (16+).
**16.45** «А досвіткі тут ціхія» (12+).
**19.00** «Падольскія курсанты» (16+).
**21.40** «Ржэў» (12+).
**0.00** «Рубеж» (12+).
**1.40** «Танкі» (12+).
**3.10** «Адзін удых» (12+).
**4.50** «Кот у ботах» (6+).
**5.05** «Пеця і Чырвоная Шапачка» (6+).

### ЯСНАе

**4.30** Маст. фільм «Брэсцкая крэпасць» (12+).
**6.45** Маст. фільм «Контрудар» (12+).
**8.10** «Ясна аб футболе».
**8.45** Маст. фільм «У жніўні 44-га» (12+).
**10.35, 12.15** Серыял «Алёша» (16+).
**14.00** Серыял «Танкіст» (12+).
**15.45** Маст. фільм «Вышыня 89» (12+).
**17.30** Маст. фільм «Лета 1941-га» (16+).



**19.25** Серыял «Тапор» (16+).
**21.00** «У адкрытым доступе».
**21.30** «PROфутбол».
**21.50, 23.30** Серыял «Ордэн» (16+).
**1.00** Маст. фільм «Чаклун і Румба» (12+).



**2.20** Маст. фільм «Палымя» (12+).

### ЗВЯЗДА

**6.00** «Друкаваны фронт. Газеты стралялі ва ўпор». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Азарычы. Ахвяры «Эскулапа». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 17.15, 22.40** «Вішебшчына. Партызанскі край».
**7.45, 13.05** «Чырвоны колер папараці». Маст. фільм (12+).
**8.50** «Дзяржаўная граніца. «Усходняя граніца». Маст. фільм (12+).



**11.20, 12.10, 17.40, 18.30** «Наркамаўскі абоз» (16+).
**14.15, 15.00** «Чырвоная капэла» (12+).
**15.45** «У бой ідуць адны «старыя». Маст. фільм (12+).
**19.20** «Паліцаі ўмацаваны раён».
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**19.50** «Жывая памяць».
**19.55** «Дзяржаўная граніца. «Чырвоны пясок». Маст. фільм (12+).
**22.25** «Паміж мірам і вайной. Спецзаданне». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Партызанская граніца». Дак. фільм (12+).
**0.15** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**0.45** «Трасцянец. Алея смерці». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Брэсцкая крэпасць. Невядомая абарона». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Шпіён з-пад Вілейкі». Дак. фільм (12+).
**2.45** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**3.45** «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




# ВАДАЛАЗЫ,
## альбо Не руш чужых груш

Некалі ў вёсцы ўсё ведалі пра ўсіх — і пра дарослых, і пра малых. Мішка Дзятлік (гэта яго першая мянушка) быў з сярэдніх, са школы яшчэ закаханых у Ванду. Зорак з неба ён не хапаў — вучыўся на трактарыста, але быў на дзіва ўпартым.

Ванда — адзіная дачка дзядзькі Якуба — засталася без маці гадоў з 12, набыла прафесію бухгалтара, але па размеркаванні працаваць не паехала: засталася пры бацьку, уладкавалася на пошту. Талковая, разумная дзеўка, а ўжо ж прыгожая... Кавалераў было — хоць адбаўляй!.. І ці не кожнаму Мішка з Сёмкам, сваім сябруком, давалі зразумець (не словамі дык кулакамі), што Ванда — не для яго, што яна як быццам... занятая.

Раздражнялі дзяўчыну і гэтыя бойкі, і размовы, і Мішка са сваімі намёкамі...

Сустрэла яго на вуліцы, цвёрда сказала, каб шукаў сабе іншую — на яе не разлічваў, нават не спадзяваўся!

Тое ж самае сябру казаў і Сёмка, нейкім Сізіфам яшчэ абзываў, але ўпарты хлопец нікога не слухаў, горш за тое — ён прыдумаў, як можна дабіцца свайго.

План у Мішы быў вось такі: Ванда прыйдзе да азярыны мыць бялізну. Сябрукі — удвух — падпільнуюць яе, Мішка — адзін — наблізіцца і паваліць (калі сам не здужае, то Сенька падбяжыць, дапаможа і тут жа ўцячэ)...

Што далей?

Ды нічога такога, бо Мішка ж не дурань! Значыць, дзейнічаць не будзе. Яму б — трохі прапрымацца, пачакаць, каб нехта (пажадана з вясковых пляткарак) убачыў іх на траве, пусціў пагалоску... Тады Вандзе нічога не застанецца, як сядзець у дзеўках альбо... выходзіць за Мішку.

Сёмку гэты план зусім не падабаўся, але ж ён урэшце згадзіўся прычыніцца — хутчэй з цікаўнасці.

І вось...

Ванда скончыла мыццё-паласканне — з корабам на плячы сышла з масткоў, паднялася на высокі бераг — прытамілася.

— Давай дапамагу! — падскочыў да яе Міша.

— Без саплівых абыдуся! — фыркнула Ванда і адвярнулася.

Хлопец, як выглядала, толькі гэтага і чакаў: рукамі, як абцугамі, абвіў дзяўчыну за талію, спрабуючы паваліць.

Ды не на тую напаў: Ванда схапіла яго за валасы, лёгка адарвала ад сябе, надавала кухталёў і спіхнула ўніз, у ваду, у возера.

Сёмка, які гэта пабачыў, забыўся на ўсе дамовы: ён аж зайшоўся ад рогату!

Ванда — не пацярпела: падышла (а хлопец і не ўцякаў, бо віны за сабой не ведаў), схапіла за каўнер, падцягнула бедака да берага і штурхнула... Сёмка плюхнуўся побач з сябрам.

— Паглядзіце на іх! Кавалеры знайшліся! — крычала тым часам Ванда. — Шчанюкі шалудзівыя! Патаплю! Абодвух!

Дзяўчына і сапраўды падабрала на беразе жэрдку і разоў колькі адпіхнула «плыўцоў» ад берага.

— За што ты іх? — спытала ў Ванды суседка, што падышла якраз з корабам бялізны.

— Яны ведаюць, — адказала дзяўчына, забрала свае рэчы і рушыла дамоў.

— Вылазьце! — скамандавала хлопцам цётка. — А то пахварэеце... Ваду ад страху не сапсавалі? Бо мне ж тут адзежу мыць... І вы сваю павыкручвайце, вадалазы няшчасныя.

...Вось так Мішка Дзятлік стаў Мішкам Вадалазам.

Паходжанне новай мянушкі не магло не зацікавіць участковага. Ён адразу наведаўся да Ванды, прапанаваў напісаць заяву на свайго крыўдзіцеля.

Дзяўчына адмовілася: сказала, што яна сама, без міліцыі, каго хочаш пакрыўдзіць.

Аднак участковы (на той час малады-нежанаты) гэтага, відаць, не спужаўся, бо яго матацыкл усё часцей і часцей стаў спыняцца каля хаты дзядзькі Якуба.

**Ніна Кандрашонак,**

*г. Петрыкаў.*

# РОЙ, АЛЕ Ж ЦІ ТОЙ?

Жыццё — нібы ў казцы: чым далей — тым страшней. Цяпер, кажуць, вос шмат развялося, могуць так чалавека пакусаць, што ніякі доктар не дапаможа! І па вуллях шастаюць, пчол ядуць, а што недаелі, носяць сваім асянятам.

Гэта адзін пчаляр расказваў — па тэлевізары. Але ж не ўсе яго глядзяць, не ўсе розных ворагаў баяцца. Тая ж Нінка, напрыклад (за вочы яе Ніньдзяй завуць, бо розумам амаль не карыстаецца, не думае, што казаць, што не казаць, што рабіць, што не...).

Дык вось пайшла яна неяк у свой агарод — чуе гул у малінніку. Глянула — рой... Невялікі: памерам і формай, — можа, з талерку. «Мусіць, не ўвесь яшчэ прыляцеў? — сцяміла Ніна. — Зараз іншыя пчолы "падцягнуцца", а я тут як тут: здыму гэтую "талерачку" і адсаджу». (Куды канкрэтна — яна пакуль не думала, проста мядку карцела, прычым задарма, бо рой жа сам прыляцеў.)

Хацела глянуць на яго бліжэй — залётныя абурыліся. Асобныя — дык і што: «адарваліся» ад іншых і ў наступленне...

Ніна таксама пайшла, нават пабегла — нешта апранаць.

На ногі нацягнула гумовікі, на галаву і вушы — вязаную шапку, на плечы — плашч-дажджавік з капюшонам на завязках... Граблі з сабой узяла — рушыла ў бок малінніку.

«Пчолы» быццам чакалі яе: дружна так загулі, узляцелі, палезлі ў вочы.

Ніна зноў уцякла: вырашыла паклікаць Веру, сваю суседку.

Тая, бедная, толькі з могілак прыйшла — уся ў расстроеных думках... На акно свае азірнулася, — хтосьці ў чорным... З касой... Тут хоць-нехаць пра смерць падумаеш!

Але ж самлець жанчына не паспела — пачула, што пад дзвярыма Ніна крычыць: не бойся, маўляў, выходзь! У малінніку рой прыляцеў... Калі разам ад садзім, дык разам і мядку паядзім... Толькі ты апраніся... І вілы вазьмі.

Грэх суседцы адмовіць, — Вера паслухала.

Удзвюх, як дзве здані (адна худая з граблямі, другая тоўстая з віламі, у доўгіх балахонах з капюшонамі), жанчыны пайшлі на «рой».



— Слухай, на пчаліны ён не падобны, — здалёк усумнілася Вера. — Можа, гэта восы?

— Баязліваму і корч — мядзведзь! Лезем! — загадвае смелая Ніна.

Мусіць, думала, што «пчолы» іх спужаюцца... Ажно не: суседкі ледзьве ўцяклі!

Вырашылі спецыялістаў да справы падключыць. Ніна па мабільным мясцоваму пчаляру пазваніла, папрасіла, каб прыйшоў, каб рыштунак узяў...

Той жанчынам не адмовіў, а на месцы пасля «разведкі» апрануўся як след, зарадзіў свой дымар, зняў тую «талерку» — пасадзіў «пчол» у скрынку. Сказаў яшчэ, што з гэтага рая... нічога, маўляў, не атрымаецца, што вос трэба знішчаць.

— А воечкі! — завохкала Ніна. — Я ж так мядку свайго хацела, я ж так на яго спадзявалася!..

Завесці пчол тым разам не атрымалася. А вось веды жанчына набыла — практычныя, без рознай там доўгай падрыхтоўкі: яшчэ адзін рой прыляціць і ўжо тады...

Вы там, калі ласка, асцярожней каля сваіх малінікаў!

**Соф'я Кусянкова,**

*Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# ПЕРАДВЕЛІКОДНАЕ ЧЫТАННЕ

## Пра словы, якія даюць адчуванне вялікага свята

ПЕРАД Вялікаднем заўсёды хочацца чытаць, дакладней, перачытваць штосьці адпаведнае. Я кожны раз дастаю з паліцы тры кнігі, якія гэтымі днямі трэба абавязкова разгарнуць, і нейкія ўрыўкі з іх пачытаць. Яны са мной з юнацтва, пераязджалі ва ўсе інтэрнаты і кватэры, чытаныя-перачытаныя неаднойчы. Але кожны год увесну згадваеш менавіта пэўны эпізод з кожнай з іх і спяшаешся перачытаць, нібы хочаш пераканацца, што ў гэтым шалёным свеце ёсць рэчы, якія не мяняюцца ні пры якім раскладзе.

СПАЧАТКУ я дастаю з паліцы Біблію. Асобнік у мяне адмысловы — выдадзены ў 1988 годзе ў Стакгольме да 1000-годдзя хрышчэння Русі. Кніга сама па сабе надзвычай прыгожая — з залатымі літарамі на вокладцы, з багатымі ілюстрацыямі — сучаснымі фота мясцін, дзе адбываліся апісаныя ў Кнізе кніг падзеі. Яе мне падарыла калісьці баптыстка цётка Валя. У нашай вёсцы жыў яе бацька, і яна, прыязджаючы да яго, вельмі актыўна спрабавала мяне ў сваю веру павярнуць. Абяцала ўсе даброты і выгоды, нават добрага непітушчага мужа ў будучыні. Прыносіла брашуркі і кніжкі. Яны так і згубіліся дзесьці нечытанымі, а вось кананічная Біблія засталася. Яе ў пятнаццаць гадоў толькі пагартала, паглядзела фота, а праз год, якраз перад Вялікаднем, змагла ўжо пачытаць Новы Запавет. Уражаная была вельмі, нават маме і бабулі зачытвала ўслых асобныя месцы... Усю кнігу адолела гадоў праз дзесяць. Да некаторых месцаў там трэба проста дарасці, каб зразумець.

СЁЛЕТА перачытаць захацелася Нагорную пропаведзь. Асабліва той урывак, дзе «Не судзіце, каб вам не быць судзімымі». Кожны раз наноў здзіўляюся таму, што ўсе гэтыя агульнавядомыя рэчы, якія часта, дарэчы, і не вельмі любім паўтараць, аказваецца, гучалі з вуснаў Хрыста і напісаныя вось у гэтай кнізе ў сінім з залатым вокладкі. І пра меру, якой мераем, такой і нам будзе адмерана, і пра парушынку ў чужым воку і бервяно ў сваім, і пра святыні, якія не варта аддаваць сабакам, і пра жэмчуг, які не варта сыпаць перад свіннямі. І вось гэта: «Шукайце, і вы знойдзеце; стукайцеся, і вам адчыняць...»

ЯШЧЭ адна мая абавязковая перадвялікодная кніга — «Майстар і Маргарыта». У адзінаццатым класе яна ў нас была ўключана ў спіс пазакласнага чытання (былі часы позняй перабудовы). Вы можаце не верыць, але тады, у сямнаццаць гадоў, мяне захапіла не гісторыя кахання, а паралельная, нібы з іншага вымярэння, гісторыя Іешуа Га-Ноцры і Понцыя Пілата. На выпускным экзамене па рускай літаратуры творчасць Булгакава была ўпісана ў білет, і гэта пытанне дасталася мне. І я пачала праводзіць паралелі паміж Новым Запаветам і гісторыяй, апісанай у рамане. Чым, памятаю, увяла ў ступар цётку з рана, якая прысутнічала на экзамене. Пяцёрку я атрымала тады толькі дзякуючы маім настаўнікам — выкладчыцы і дырэктару школы, якія занялі прынцыповую пазіцыю і адмовіліся зніжаць мне адзнаку за «выказванні, не вартыя камсамолкі» (цытата з той цёткі). Пасля, казалі, яна яшчэ ў раёне прапаноўвала аб'явіць спагнанне выкладчыцы і кіраўніцтву. Але на двары быў ужо 1991 год, таму свой залаты медаль я атрымала-такі. А імя той цёткі, дарэчы, і не запомніла, так і засталася ў памяці як «цётка з рана».

ЗВЫЧАЙНА я перад Вялікаднем перачытваю ўрывак пра тое, што самая страшная загана чалавека — гэта баязлівасць. А вось сёлета чамусьці захацелася пераканацца, што не прыдуманае, а ўжо напісанае і надзейна захоўваецца ў кнізе вось гэта:

«— Чым ты хочаш, каб я пакляўся? — спытаў, вельмі ажывіўшыся, развязаны.

— Ну, хоць бы жыццём тваім, — адказаў пракуратар, — ім клясціся самы час, бо яно вісіць на валаску, ведай гэта!

— Ці не думаеш ты, што ты яго падвесіў, ігемон? — спытаў арыштант. — Калі гэта так, ты вельмі памыляешся.

Пілат уздрыгнуў і адказаў скрозь зубы:

— Я магу перарэзаць гэты валасок.

— І ў гэтым ты памыляешся, — светла ўсміхаючыся і засланяючыся рукой ад сонца, запярэчыў арыштант, — пагадзіся, што перарэзаць валасок ужо напэўна можа толькі той, хто падвесіў?..»

ТРЭЦЯЯ кніга, якую абавязкова дастаю з паліцы ў гэтыя дні, — другі том з васьмітомніка Караткевіча. Памятаеце, такі белы ў шэрыя кропачкі з чорным лаканічным надпісам, выдадзены яшчэ за савецкім часам. Гэта том, у якім змешчаны апавяданні. І вось у адно з іх — «Блакіт і золата дня» я калісьці проста закахалася, калі, вядома, можна закахацца не ў літаратурнага героя, а менавіта ў сам твор. Закахалася настолькі, што не вярнула гэты том у школьную бібліятэку, «згубіўшы» яго і замяніўшы нейкай іншай кніжкай. Пасля ўжо ў Мінску пашчасціла купіць у «Букіністцы» ўсё тое выданне, таму ў мяне дагэтуль другі том у двайным экзэмпляры... А што да апавядання — вядома ж, захапіла гісторыя рамантычных узаемаадносін маладых людзей. Але ж у якіх шыкоўных дэкарацыях яны развівáліся! Менавіта дзякуючы гэтаму апавяданню прыйшло разуменне, што Вялікдзень — вялікае свята. Не толькі ў тваёй хаце, не толькі ў тваёй вёсцы — для многіх мільёнаў людзей, у тым ліку і тут, у Беларусі. Быў канец 80-х гадоў, яшчэ ў школе праводзілі «разбор палётаў» за святкаванне Вялікадня і асабліва Тройцы, яшчэ стаялі зачыненыя храмы. А разуменне і веданне ўжо было. Дзякуючы вось гэтаму: «Чаўны плылі і плылі ў блакітным і залатым. Гэта лазурнае толькі часам перарывалася празрыстай сцяной затопленага лесу, — і зноў загараліся іскрамі. Сплюшчылі павекі, глыбокая цеплыня перапаўняла цела. Блакітнае і залатое, залатое і блакітнае.

Без канца. Без краю. Без мяжы...

...Якраз у гэтую хвіліну на ваду, масліста-чорную і густую, на дрэвы, на іхні згублены човен упаў першы ўдар звана...

...А на маленькім астраўку ўздымалася да неба нешта як шацёр, белае, азоранае агнямі. Менавіта адтуль далялі ўдары звана, а потым — спевы...»

КАМУСЬЦІ можа паказацца нават блюзнерствам, але менавіта вось такое спалучэнне, такое вось перадвялікоднае чытанне нараджае ў мяне адчуванне велічы, прыгажосці і незвычайнасці гэтага свята. Разумею, што гэта вельмі асабістае, але, магчыма, камусьці, хто перад Вялікаднем шукае сэнсы і спрабуе знайсці разуменне, яно і дапаможа. Прынамсі падказкай, што варта зазірнуць на кніжную паліцу.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-12, +37529 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витязь», 210605, г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-52-13.

**Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-72630,** площадью 4978 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13А/2, наименование – **административно-бытовой корпус № 15,** назначение – здание административно-хозяйственное, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000003000095, площадью 25,6294 га (право долевой аренды), по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13А, целевое назначение – зем. участок для строительства и обслуживания административно-производственных зданий.

**Нач. цена: 645 456,56 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 64 545,65 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 16.05.2024 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 03.05.2024 с 08.30 по 15.05.2024 до 17.30.

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.**

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи предмета аукциона.

**Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витязь» от 13.04.2021.**

